633(4Беи)
К14

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

УДК 325.2–058.12(474/476)ВКЛ(091)(043.3)

КАЗАКОЎ
АЛЯКСАНДР УЛАДЗІМІРАВІЧ

# ЭМІГРАЦЫЯ ЗНАЦІ З РУСКІХ КНЯСТВАЎ У ВЯЛІКАЕ КНЯСТВА ЛІТОЎСКАЕ (40-я гг. XV – 30-я гг. XVI ст.)

Аўтарэферат
дысертацыі на суісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук
па спецыяльнасці 07.00.03 – Усеагульная гісторыя

Установа адукацыі
«Віцебскі дзяржаўны універсітэт
імя П.М. Машэрава»
НАВУКОВАЯ БІБЛІЯТЭКА

Мінск, 2011

63.3(4Бен)я44.031
К14

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Работа выканана ў Дзяржаўнай установе адукацыі
"Беларускі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт"

Навуковы кіраўнік

**Рассадзін Сяргей Яўгенавіч**, доктар гістарычных навук, прафесар, прафесар кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі ДУА "Беларускі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт"

Афіцыйныя апаненты

**Космач Веньямін Аркадзьевіч**, доктар гістарычных навук, прафесар, дырэктар ВФ УА ФПБ «Міжнародны інстытут працоўных і сацыяльных адносін»

**Мартынюк Аляксей Віктаравіч**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі ДУА "Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы"

*20504288*

Апаніруючая арганізацыя

**ДУА "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М. Танка"**

Абарона адбудзецца 24 лютага 2011 г. у 14.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.05 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце па адрасу: 220030, г. Мінск, вул. Ленінградская, 8, аўд. 407.
Тэл. вучонага сакратара (8-017)227-45-11.
e-mail: menkovski@bsu.by

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта

Аўтарэферат разасланы «21» студзеня 2011 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый,
доктар гістарычных навук, прафесар Менькоўскі В.І.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

# УВОДЗІНЫ

На працягу сваёй доўгай гісторыі беларуская дзяржаўнасць і беларускі этнас развіваліся ў бесперапынным узаемадзеянні з суседнімі ўсходнеславянскімі дзяржаўнымі ўтварэннямі і этнасамі. Адным з вынікаў гэтага складанага і комплекснага працэсу стала тое, што беларускі і рускі народы, лёсы якіх былі цесна звязаныя гістарычна, знаходзяцца зараз у адзінай цывілізацыйнай прасторы. На сённяшні дзень Расійская Федэрацыя з'яўляецца найважнейшым партнёрам Рэспублікі Беларусь у палітычнай, эканамічнай, вайсковай і культурнай сферах, а рускія ў нашай краіне складаюць колькасна найвялікшую з нацыянальных меншасцяў. Гэта абумоўлівае натуральную неабходнасць паглыблення добрасуседскіх адносін, а ацэнка перспектыў супрацоўніцтва ў будучыні – вывучэння агульнай гістарычнай спадчыны, беларуска-рускіх сувязяў у мінулым. Прадстаўленае дысертацыйнае даследаванне служыць гэтай мэце.

Знаць з усходнеславянскіх княстваў спарадычна з'яўлялася пры двары вялікіх князёў літоўскіх яшчэ на досвітку ВКЛ. Аднак, ніжняй храналагічнай мяжой даследавання абрана сярэдзіна XV ст. – час, пачынаючы з якога вывучаемая з'ява набывае перманентны характар. Выбар верхняй храналагічнай мяжы абумоўлены тым, што ў 30-я гг. XVI ст. назіраецца некаторае павелічэнне колькасці эмігрантаў, тады як за 40-я гг. крыніцы амаль не фіксуюць новых асоб. Наступная ж хваля эміграцыі з Маскай дзяржавы (да 1547 г. – Вялікае княства Маскоўскае (далей – ВКМ)) у ВКЛ звязана з палітычнымі рэпрэсіямі Івана IV і ўяўляе сабой з'яву, якая па сваім маштабе, значэнні і гістарычным кантэксце патрабуе асобнага вывучэння.

Тэрмін *знаць* часта выкарыстоўваецца ў адносінах да верхняга пласта прывілеяванага стану саслоўных грамадстваў, каб адрозніваць яго ад ніжэйшага. У дадзенай працы для абазначэння гэтых двух катэгорый будуць ужывацца тэрміны *арыстакратыя* і *дробная знаць* адпаведна. Пад *знаццю* ж мы будзем разумець усё прывілеяванае саслоўе рускіх княстваў, клас феадалаў, што адпавядае лацінскаму тэрміну "набілітэт".

Для характарыстыкі такой з'явы, як перасяленне з адной дзяржавы ў іншую, выкарыстоўваецца паняцце *эміграцыя*, а адносна саміх перасяленцаў ужываецца тэрмін *эмігрант*. У сучаснай беларускай гістарычнай навуцы тэрмін эміграцыя трактуецца як "выезд грамадзян са сваёй Бацькаўшчыны ў іншую краіну на пастаяннае або доўгае пражыванне па палітычных, рэлігійных, эканамічных, этнічных ці іншых прычынах, а таксама ў выпадку сацыяльных (войны, рэвалюцыі) або прыродных катаклізмаў".[1] З-за адсутнасці катэгорыі

[1] Ціхаміраў, А. Эміграцыя / А. Ціхаміраў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал. : Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2003. – Т. 6, ч. 2. – С. 256–262.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

грамадзянства ў XV – XVI стст. асноўнай прыкметай эміграцыі, разам са зменай краіны пастаяннага жыхарства, выступае змена падданства; этнічнае паходжанне эмігрантаў не выступае ў якасці вызначальнай прыкметы.

Да прадмета даследавання належыць знаць, якая перасялілася ў ВКЛ з іншых усходнеславянскіх зямель: Маскоўскай, Цвярской, Разанскай, Наўгародскай, Пскоўскай. У рамках дадзенай працы ўяўляецца мэтазгодным выкарыстаць для гэтых дзяржаў абагульняючае паняцце *рускія княствы.*

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЦЫ

**Сувязь працы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі**

Тэма дысертацыі была зацверджана Саветам Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта (пратакол № 3 ад 28.11.2006 г.), а таксама ўдакладнена рашэннем вышэйназванага савета (пратакол № 6 ад 26.01.2010 г.) і навукова-метадалагічнага семінара гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта (пратакол № 7 ад 16.11.2010 г.). Правядзенне даследавання было падтрымана грантам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, выдзеленым на выкананне на працягу 2008 г. тэмы ГБ 28-038 "Прадстаўнікі маскоўскай арыстакратыі на беларускіх землях як фактар у знешняй і ўнутранай палітыцы ВКЛ (XV–XVII стст.)" (№ дзяржрэгістрацыі 20080812).

**Мэта і задачы даследавання**

*Мэта даследавання* – вызначэнне прычын, абставін і наступстваў эміграцыі знаці з рускіх княстваў у ВКЛ у 40-х гг. XV – 30-х гг. XVI ст. і характарыстыка становішча эмігрантаў у ВКЛ.

Пастаўленая мэта дасягаецца пры вырашэнні наступных задач:

- вызначыць персанальны склад эмігрантаў з рускіх княстваў сярод шляхты ВКЛ, іх колькасць, а таксама сацыяльную дыферэнцыяцыю і колькасныя суадносіны сацыяльных груп;
- вызначыць, па якіх прычынах і пры якіх абставінах адбывалася эміграцыя знаці з рускіх княстваў у ВКЛ;
- паказаць значэнне эміграцыі ў адносінах паміж ВКЛ і ВКМ;
- ахарактарызаваць палітыку ўрада ВКМ і ВКЛ адносна эмігрантаў, прасачыць, якім чынам яна змянялася на працягу даследуемага перыяду;
- вызначыць месца эмігрантаў і іх бліжэйшых нашчадкаў у прывілеяваным саслоўі ВКЛ праз аналіз іх маёмаснага становішча, сямейных адносін і службы вялікім князям літоўскім.

*Аб'ектам* даследавання з'яўляюцца міграцыйныя працэсы ва Усходняй Еўропе ў 40-х гг. XV – 30-х гг. XVI ст. *Прадмет* даследавання – эміграцыя

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ
знаці з рускіх княстваў у ВКЛ у 40-х гг. XV – 30-х гг. XVI ст. і яе інтэграцыя ў соцыум ВКЛ.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. У 40-х гг. XV – 30-х гг. XVI ст. прадстаўнікі розных пластоў прывілеяванага саслоўя рускіх зямель эміргавалі ў ВКЛ. Маса эмігрантаў падзяляецца на дзве вялікія групы: арыстакратыю і дробную знаць. Першая, колькасна меншая, складалася з трох катэгорый – вялікіх і ўдзельных князёў, служылых князёў і баярскай арыстакратыі. Другую ўтварала дробная знаць ("дзеці баярскія"). Краінай паходжання абсалютнай большасці эмігрантаў было ВКМ. Агульная іх колькасць за разглядаемы перыяд складала сотні чалавек. Пайменна вядома звыш 150 асоб, 22 з якіх належалі да арыстакратыі.

2. Асноўныя прычыны, якія прымусілі арыстакратыю рускіх княстваў да перасялення ў ВКЛ у 40-х гг. XV – 30-х гг. XVI ст., характарызуюцца як палітычныя. Эміграцыя эліты Маскоўскага, Цвярскога і Разанскага княстваў стала наступствам яе паражэння у ваенна-палітычным супрацьстаянні з вялікімі князямі маскоўскімі. У канцы XV – 30-х гг. XVI ст., пасля ўключэння ў склад ВКМ шэрагу іншых дзяржаў усходнеславянскага абшару і аб'яднання пад яе ўладай "нелітоўскіх" зямель Русі, эміграцкая арыстакратыя была прадстаўлена амаль выключна выхадцамі з асяроддзя служылых князёў і баярскай эліты. У гэты перыяд эміграцыя ў ВКЛ магла быць выклікана не толькі палітычнымі, але і іншымі прычынамі, якія мелі ў пэўнай ступені суб'ектыўны характар: незадавальненне ўласным сацыяльным становішчам, адсутнасць перспектыў паспяховай кар'еры пры маскоўскім двары і інш. Самым распаўсюджаным шляхам перасялення ў ВКЛ княскай і баярскай арыстакратыі з'яўляліся ўцёкі.

3. З сярэдзіны XV ст. уцёкі ў ВКЛ апазіцыйнай вялікім князям маскоўскім княскай і баярскай эліты, як здзейсненыя, так і няўдалыя, сталі пастаяннай з'явай. Існаванне кола эмігрантаў у суседняй краіне як арганізаванай апазіцыі за мяжой прадстаўляла не толькі патэнцыяльную, але і рэальную небяспеку для ВКМ, што стварала для ўрада ВКЛ аб'ектыўную магчымасць выкарыстаць гэты патэнцыял для вырашэння знешнепалітычных задач. Аднак у сярэдзіне – канцы XV ст. ён застаўся незапатрабаваным урадам ВКЛ з-за адсутнасці актыўнай усходняй палітыкі. У канцы XV – першай трэці XVI ст. ва ўмовах пастаяннай ваенна-палітычнай канфрантацыі з ВКМ эміграцкае пытанне актуалізавалася для кіруючых колаў ВКЛ, аб чым сведчаць спробы простага выкарыстання імі эмігрантаў пры вырашэнні знешнепалітычных задач.

4. Арыстакратыя з рускіх зямель, што перасялілася ў ВКЛ у 40-х гг. XV – 30-х гг. XVI ст., была паспяхова інтэгравана ў прывілеяванае саслоўе краіны, што пацвярджаецца яе маёмасным становішчам, кар'ерамі на дзяржаўнай службе, а таксама сямейнымі сувязямі з мясцовым набілітэтам. Прадстаўнікі эміграцкай арыстакратыі валодалі зямлёй, парадніліся з мясцовай знаццю, праявілі сябе на службе манархам. Іх сацыяльныя пазіцыі ў ВКЛ залежалі не

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

толькі і не столькі ад паходжання і статуса на радзіме кожнай канкрэтнай асобы, але і ад таго значэння, якое мела яе эміграцыя для ўрада ВКЛ у знешнепалітычнай дзейнасці, а таксама ад яе лаяльнасці і службы новай уладзе.

Нягледзячы на паспяховае ўладкаванне ў ВКЛ, некаторыя эмігранты (Васіль Яраславіч Бораўскі разам з іншымі паплечнікамі Васіля II, Міхаіл Барысавіч Цвярскі, Сямён Фёдаравіч Бельскі) пакідалі гэту краіну без санкцыі яе ўрада. Ажыццяўляючы дзейнасць, накіраваную супраць улад ВКМ, яны працягвалі ўплываць на ўнутры- і знешнепалітычнае становішча гэтай дзяржавы.

5. Каля паловы пайменна вядомых прадстаўнікоў дробнай знаці з рускіх зямель заняла ў ВКЛ пасады гаспадарскіх дваран, што давала ім пэўныя гарантыі трывалага матэрыяльнага становішча і абароны з боку манарха. Яны атрымлівалі адносна невялікія зямельныя ўладанні, памеры якіх дазваляюць аднесці гэту групу эмігрантаў да ліку дробнай шляхты ВКЛ. Назіралася пэўная тэндэнцыя ў тэрытарыяльным размеркаванні іх маёнткаў. У другой палове XV ст. яны мелі аселасць у розных рэгіёнах ВКЛ, а з пачатку XVI ст. пачалі атрымліваць уладанні амаль выключна у заходніх абласцях дзяржавы. Нягледзячы на тое, што многія эмігранты былі паселены даволі кампактна, яны не ўтварылі этнічна адметнай супольнасці ў ВКЛ.

**Асабісты ўклад суіскальніка**

Дысертацыя з'яўляецца ўласным даследаваннем суіскальніка, выкананым без суаўтараў.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Вынікі дысертацыйнага даследавання былі апрабаваныя на наступных навуковых мерапрыемствах: Міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі "Актуальные проблемы из исторического прошлого и современности в общественно-гуманитарных и социорелигиоведческих науках Беларуси, ближнего и дальнего зарубежья" (Віцебск, 19–20 красавіка 2007 г.), Міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі "Европа: актуальные проблемы этнокультуры" (Мінск, 27 красавіка 2007 г.), Рэспубліканскай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі "Гістарыяграфія гісторыі Беларусі, новай і навейшай гісторыі краін Еўропы і ЗША" (Мінск, 28 красавіка 2008 г.), "Летней школе молодых историков Беларуси и России – 2008" (Мінск, 18–23 жніўня 2008 г.), Міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі "Русские княжества, Литва и Орда в системе этнокультурных взаимоотношений" (Тула, Кулікова поле, 6–8 лістапада 2008 г.), Рэспубліканскай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі "Няфёдаўскія чытанні" (Мінск, 19 сакавіка 2009 г.), Міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі "Середньовічні старожитності Центрально-Східної Европи" (Чарнігаў, 10–12 красавіка 2009 г.).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Вынікі даследавання прадстаўлены ў 12 публікацыях аўтара. 6 з іх агульным аб'ёмам 2,9 аўтарскага аркуша змешчаны ў выданнях,

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

рэкамендаваных ВАК Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйнага даследавання, 6 – у іншых навуковых зборніках і матэрыялах канферэнцый. Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў складае 4,1 аўтарскага аркуша.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца са спісу абрэвіятур, уводзін, агульнай характарыстыкі працы, трох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спісу (281 пазіцыя, 12 з якіх – публікацыі аўтара), аднаго дадатку ў выглядзе табліцы. Поўны аб'ём дысертацыі складае 154 старонкі. Дадатак займае 17 старонак.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Ва **ўводзінах** паказана неабходнасць правядзення даследавання па дадзенай тэме, абгрунтавана яе актуальнасць, вызначаны храналагічныя рамкі даследавання і тэрміналагічны апарат.

Агульная характарыстыка дысертацыйнага даследавання выканана ў поўнай адпаведнасці з патрабаваннямі ВАК Рэспублікі Беларусь.

У **першай главе "Гістарыяграфія, крыніцы і метадалогія даследавання"** праведзены аналіз гістарыяграфіі праблемы і выкарыстаных крыніц, дадзена характарыстыка метадалогіі даследавання.

У *раздзеле 1.1 "Гістарыяграфія"* прадстаўлены паводле праблемнага і храналагічнага прынцыпаў агляд навуковай літаратуры, прысвечанай пытанню эміграцыі знаці з рускіх княстваў у XV–XVI стст. ці асобным яго аспектам.

Пытанне эміграцыі знаці з рускіх княстваў у сярэдзіне XV – 30-х гг. XVI ст. трапіла ў поле зроку гісторыкаў яшчэ ў XIX ст., але знаходзілася на перыферыі тэматыкі іх даследаванняў. Асобныя выпадкі эміграцыі разглядаліся выключна ў кантэксце гісторыі Маскоўскай дзяржавы, Цвярскога і Разанскага княстваў, ВКЛ, гісторыі міждзяржаўных адносін такімі аўтарамі, як С.М. Салаўёў, Д.І. Ілавайскі, У.С. Барзакоўскі, І.І. Смірноў, А.А. Зімін, К.В. Базілевіч, А.Л. Харашкевіч, Б.М. Флора, Л. Каланкоўскі, Ф. Папэ і інш[2].

---

[2] Соловьев, С.М. История России с древнейших времен / С.М. Соловьев. – Кн. 3, Т. 5–6 : 1463–1584. – М. : АСТ ; Харьков : Фолио, 2001. – 991 с.; Иловайский, Д.И. История Рязанского княжества / Д.И. Иловайский. – М. : В университетской типографии, 1858. – 329 с.; Борзаковский, В.С. История Тверского княжества / В.С. Борзаковский. – М. : Рубежи XXI, 2006. – 503, [1] с.; Смирнов, И.И. Очерки политической истории Русского государства 30–50-х гг. XVI в. / И.И. Смирнов. – М ; Ленинград : Изд-во АН СССР, 1958. – 516 с.; Зимин, А.А. Витязь на распутье : Феодальная война в России в XV в. / А.А. Зимин. – М. : Мысль, 1991. – 286 с.; Зимин, А.А. Россия на пороге нового времени (очерки политической истории России первой трети XVI в.) / А.А. Зимин. – М. : Мысль, 1972. – 452 с.; Зимин, А.А. Россия на рубеже XV–XVI столетий : очерки социально-политической истории / А.А. Зимин. – М. : Мысль, 1982. – 333 с.; Базилевич, К.В. Внешняя политика русского централизованного государства. Вторая половина XV века / К.В. Базилевич. – М. : Территория, 2001. – 544 с.; Хорошкевич, А.Л. Русское государство в системе международных отношений конца XV – начала XVI века / А.Л. Хорошкевич. – М. : Наука, 1980. – 293 с.; Флоря, Б.Н. Великое княжество

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ
саслоўе краіны, што пацвярджаецца іх маёмасным становішчам, дзяржаўнай службай, публічнай дзейнасцю, а таксама шлюбнымі адносінамі з мясцовым набілітэтам. Гэта адбылося нягледзячы на юрыдычна замацаваную забарону іншаземцам набываць уладанні і займаць урады. Іван Дзмітрыевіч Шамячыч, Іван Андрэевіч Мажайскі, Іван Васільевіч Яраславіч дзякуючы пэўнай унутрыпалітычнай кан'юнктуры атрымалі ў 50-х гг. XV ст. удзелы і сталі аднымі з найбуйнейшых землеўладальнікаў краіны. У далейшым набыццё эмігрантамі такіх буйных уладанняў стала немагчымым, іх маёмаснае становішча забяспечвалася маёнткамі, а не ўдзеламі.

Сацыяльныя пазіцыі, якія займала эмігранцкая эліта ў ВКЛ, залежалі не толькі і не столькі ад паходжання і статуса на радзіме кожнай канкрэтнай асобы, але і ад таго значэння, якое мела яе эміграцыя для ўрада ВКЛ, ад яе лаяльнасці новай уладзе. Таму такія асобы, як вялікі князь цвярскі і вялікі князь разанскі засталіся пры меншых маёмасных набытках у параўнанні з Іванам Цімафеевічам Юрловым (з роду Пляшчэевых), Іванам Васільевічам Лядскім і Сямёнам Фёдаравічам Бельскім. З эмігрантаў канца XV – 30-х гг. XVI ст. найбольш высокага маёмаснага становішча ўдалося дасягнуць князю Мацвею Мікіцінічу, што стала магчымым дзякуючы яго блізкасці да вялікакняскай сям'і і з'яўлялася выключным выпадкам [7, 6, 2, 10].

5. Значная частка дробнай знаці з рускіх княстваў набывала ў ВКЛ пасады гаспадарскіх дваран, што давала ім пэўныя гарантыі трывалага матэрыяльнага становішча і абароны з боку манарха, магчымасць кар'еры пры двары. Паводле перапісу дваран 1509 г. выхадцы з рускіх княстваў складалі 21 % ад агульнай іх колькасці. З пайменна вядомых асоб дробнай знаці за ўвесь разглядаемы перыяд каля 50 % служылі вялікаму князю асабіста (у якасці гаспадарскіх дваран і гаспадарскіх сакольнікаў).

Дробная знаць з рускіх княстваў атрымлівала ў ВКЛ уладанні, памеры якіх дазваляюць аднесці гэту катэгорыю землеўладальнікаў да ліку дробнай шляхты. Назіралася пэўная тэндэнцыя ў тэрытарыяльным размеркаванні яе маёнткаў. У другой палове XV ст. землі эмігрантаў знаходзіліся ў розных частках Княства. Прыблізна з пачатку XVI ст. яны сталі атрымліваць уладанні амаль выключна ў заходніх абласцях ВКЛ (Заходняя Беларусь, Літва, Жамойць, Падляшша, Валынь). Пэўная канцэнтрацыя маёнткаў эмігрантаў мела месца ў Жараслаўскай воласці Гарадзенскага павета і ў мястэчку Жалудок Троцкага павета [8, 11].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Вынікі дысертацыйнага даследавання і матэрыялы, якія ў ім утрымліваюцца, могуць быць выкарыстаны для далейшай навуковай распрацоўкі пытанняў сацыяльна-палітычнай гісторыі ВКЛ XV–XVI стст.,

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ
пытанняў генеалогіі, пры падрыхтоўцы абагульняючых прац, курсаў лекцый і спецкурсаў па гісторыі Беларусі, могуць прымяняцца супрацоўнікамі навуковых устаноў, архіваў і музеяў у прафесійнай дзейнасці.

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ СУІСКАЛЬНІКА

### Артыкулы

1. Казакоў, А.У. Абставіны і вынікі княскай эміграцыі з Маскоўскай дзяржавы ў Вялікае княства Літоўскае ў другой палове XV ст. / А.У. Казакоў // Тр. Белорус. гос. технол. ун-та. Сер. V, Политология, философия, история, филология. – 2007. – Вып. 15. – С. 134–137.
2. Казакоў, А.У. Эміграцыя князёў з роду Пронскіх у Вялікае княства Літоўскае / А.У. Казакоў // Науч. тр. Респ. ин-та высш. шк. Исторические и психолого-педагогические науки : сб. науч. ст. – Минск, 2008. – Вып. 6, ч. 1 / под ред. В.Ф. Беркова. – С. 118–126.
3. Казакоў, А.У. Князь Мацвей Мікіцініч: паходжанне і эміграцыя / А.У. Казакоў // Studia Historica Europae Orientalis = Исследования по истории Восточной Европы : науч. сб. / Респ. ин-т высш. шк. – Минск, 2008. – Вып. 1 / редкол.: А.В. Мартынюк (отв. ред.) [и др.]. – С. 77–83.
4. Казакоў, А.У. Эмігранты з рускіх зямель сярод шляхты ВКЛ у канцы XV – першай палове XVI ст.: праблема выяўлення / А.У. Казакоў // Науч. тр. Респ. ин-та высш. шк. Исторические и психолого-педагогические науки : сб. науч. ст. – Минск, 2009. – Вып. 8, ч. 1 / под ред. В.Ф. Беркова. – С. 41–47.
5. Казакоў, А.У. Эмігранты з рускіх зямель у Вялікім княстве Літоўскім (сярэдзіна XV – 30-я гг. XVI ст.): сацыяльны склад / А.У. Казакоў // Тр. Белорус. гос. технол. ун-та. Сер. V, Политология, философия, история, филология. – 2009. – Вып. 17. – С. 122–125.
6. Казакоў, А.У. Тытулаваная знаць з Маскоўскай дзяржавы ў Вялікім княстве Літоўскім у канцы XV – 30-х гг. XVI стст. / А.У. Казакоў // Вестник Полоцкого гос. ун-та. Серия А: гуманит. науки. – 2010. – № 1. – С. 27–30.
7. Казакоў, А.У. Знаць з рускіх зямель на службе ў вялікіх князёў літоўскіх (80-я гг. XV – сярэдзіна XVI ст.) / А.У. Казакоў // Тр. Белорус. гос. технол. ун-та. Сер. V, Политология, философия, история, филология. – 2010. – Вып. 18. – С. 35–39.

### Матэрыялы міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцый

8. Казакоў, А.У. Князі-эмігранты з Маскоўскай Русі і іх нашчадкі на Беларускіх землях у сістэме адносін Вялікага княства Літоўскага з Маскоўскім вялікім княствам (сярэдзіна XV – пачатак XVI ст.) / А.У. Казакоў // Актуальные

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

проблемы из исторического прошлого и современности в общественно-гуманитарных и социо-религиоведческих науках Беларуси, ближнего и дальнего зарубежья : материалы Междунар. науч.-теорет. конф., Витебск, 19–20 апр. 2007 г. : в 2 ч. / Витеб. гос. ун-т. ; редкол.: В.А. Космач (гл. ред.) [и др.]. – Витебск, 2007. – Ч. 1. – С. 42–44.

9. Казакоў, А.У. Прадстаўнікі арыстакратыі Маскоўскай Русі і іх нашчадкі на беларускіх землях ВКЛ (сярэдзіна XV – пачатак XVI ст.) / А.У. Казакоў // Европа: актуальные проблемы этнокультуры : материалы Междунар. науч.-теорет. конф., Минск, 27 апр. 2007 г. / Белорус. гос. пед. ун-т ; редкол.: В.В. Тугай (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2007. – С. 153–154.

10. Казакоў, А.У. Эміграцыя князёў і баярства з рускіх зямель у Вялікае княства Літоўскае ў 1440–1580-х гг.: гістарыяграфія пытання / А.У. Казакоў // Гістарыяграфія гісторыі Беларусі, новай і навейшай гісторыі краін Еўропы і ЗША : матэрыялы Рэсп. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 28 сак. 2008 г. : у 2 ч. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; В.А. Пілецкі (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2008. – Ч. 1 : Гістарыяграфія гісторыі Беларусі (ад старажытных часоў да кастрычніка 1917 г.). – С. 32–34.

11. Казаков, А. О политике правительства Великого княжества Литовского по отношению к эмигрантам из русских земель (середина XV – середина XVI в.) / А. Казаков // Середньовічні старожитномті Центрально-Східної Європи : матеріали VIII студент. наук. археол. конф., Чернігів, 10–12 квіт. 2009 р. / Ін-т археології НАН Україні, Черніг. держ. пед. ун-т, Ін-т археології та стародав. історії Півн. Лівобережжя ; В.П. Коваленко (відп. ред.). – Чернігів, 2009. – С. 66–67.

12. Казакоў, А.У. Да пытання аб колькасным складзе эмігрантаў з рускіх зямель у Вялікім княстве Літоўскім (сярэдзіна XV – 30-я гг. XVI стст.) / А.У. Казакоў // Вялікае княства Літоўскае ў гісторыі і культуры Беларусі : Зб. навук. арт. / Пад рэд. А.У. Любага. – Мінск : Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтва. – 2009. – С. 25–28.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

## РЭЗЮМЭ

**Казакоў Аляксандр Уладзіміравіч**

## Эміграцыя знаці з рускіх княстваў у Вялікае Княства Літоўскае (40-я гг. XV – 30-я гг. XVI ст.)


**Ключавыя словы:** эміграцыя, эмігранты, знаць, рускія княствы, арыстакратыя, дробная знаць, прывілеяванае саслоўе ВКЛ, знешняя палітыка, унутраная палітыка.

**Аб'ект даследавання:** міграцыйныя працэсы ва Усходняй Еўропе ў 40-х гг. XV – 30-х гг. XVI ст.

**Прадмет даследавання:** эміграцыя знаці з рускіх княстваў у ВКЛ у 40-х гг. XV – 30-х гг. XVI ст. і яе інтэграцыя ў соцыум ВКЛ.

**Мэта даследавання:** вызначэнне прычын, абставін і наступстваў эміграцыі знаці з рускіх княстваў у ВКЛ у 40-х гг. XV – 30-х гг. XVI ст. і характарыстыка становішча эмігрантаў у ВКЛ.

**Метадалогія даследавання.** Праца грунтуецца на прынцыпах аб'ектыўнасці, гістарызму і сістэмнасці. Былі выкарыстаны дзве групы метадаў: агульнанавуковыя (аналіз і сінтэз, класіфікацыя і тыпалагізацыя, індукцыя і дэдукцыя) і спецыяльна-гістарычныя (гісторыка-генетычны і гісторыка-параўнальны метады, а таксама метад гістарычнай рэканструкцыі).

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.** Упершыню была даследавана з'ява эміграцыі знаці з рускіх княстваў у ВКЛ у 40-х гг. XV – 30-х гг. XVI ст. Была праведзена сацыяльная дыферэнцыяцыя масы эмігрантаў, дадзена колькасная характарыстыка з'явы, прасочаны змены ў палітыцы ВКЛ у адносінах да эмігрантаў на працягу разглядаемага перыяду і вызначаны прычыны гэтых змен, прааналізавана становішча эмігрантаў у ВКЛ, у тым ліку дробнай знаці. Шэраг крыніц быў уведзены ў навуковае абарачэнне.

Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы абагульняючых прац па гісторыі Беларусі, курсаў лекцый і спецкурсаў па гісторыі Расіі і Беларусі XV–XVI стст., а таксама супрацоўнікамі навуковых устаноў, архіваў і музеяў у сваёй прафесійнай дзейнасці.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

# РЕЗЮМЕ

**Казаков Александр Владимирович**

## Эмиграция знати из русских княжеств в Великое княжество Литовское (40-е гг. XV – 30-е гг. XVI в.).

**Ключевые слова:** эмиграция, эмигранты, знать, русские княжества, аристократия, мелкая знать, привилегированное сословие ВКЛ, внешняя политика, внутренняя политика.

**Объект исследования:** миграционные процессы в Восточной Европе в 40-х гг. XV – 30-х гг. XVI в.

**Предмет исследования:** эмиграция знати из русских княжеств в ВКЛ в 40-х гг. XV – 30-х гг. XVI в. и ее интеграция в социум ВКЛ.

**Цель исследования:** установление причин, обстоятельств и последствий эмиграции знати из русских княжеств в ВКЛ в 40-х гг. XV – 30-х гг. XVI в. и характеристика положения эмигрантов в ВКЛ.

**Методология исследования.** Работа основана на принципах объективности, историзма и системности. Были использованы две группы методов: общенаучные (анализ и синтез, классификация и типологизация, индукция и дедукция) и специально-исторические (историко-генетический и историко-сравнительный методы, а также метод исторической реконструкции).

**Научная новизна и значимость полученных результатов.** Впервые было исследовано явление эмиграции знати из русских княжеств в ВКЛ в 40-х гг. XV – 30-х гг. XVI в. Была проведена социальная дифференциация массы эмигрантов, дана количественная характеристика явления, прослежены изменения в политике ВКЛ по отношению к эмигрантам на протяжении изучаемого периода и установлены причины этих изменений, проанализировано положение эмигрантов в ВКЛ, в том числе мелкой знати. Ряд источников был введен в научный оборот.

Результаты исследования могут быть использованы при подготовке обобщающих работ по истории Беларуси, курсов лекций и спецкурсов по истории России и Беларуси XV–XVI вв., а также сотрудниками научных учреждений, архивов и музеев в своей профессиональной деятельности.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

# SUMMARY

**Aliaksandr Kazakou**

## Emigration of the Nobility from Russian Duchies to the Grand Duchy of Lithuania ($40^{th}$ of the $XV^{th}$ – $30^{th}$ of the $XVI^{th}$ century)

**Key words:** emigration, emigrants, nobility, Russian duchies, aristocracy, minor nobility, privileged estate of the GDL, domestic policy, foreign policy.

**Object of the research**: emigrational processes in the Eastern Europe in the $40^{th}$ of the $XV^{th}$ – $30^{th}$ of the $XVI^{th}$ century.

**Subject of the research**: emigration of the nobility from Russian duchies to the GDL in the $40^{th}$ of the $XV^{th}$ – $30^{th}$ of the $XVI^{th}$ century and it's integration into the GDL society.

**Purpose of the research**: establishment of the reasons, circumstances and consequences of emigration of the nobility from the Russian duchies in the $40^{th}$ of the $XV^{th}$ – $30^{th}$ of the $XVI^{th}$ century and it's integration into the GDL society.

**Methods of the research**. The work is based on the principles of historical method and objectivity. Two groups of methods were used: general scientific (analysis and synthesis, classification and generalization, induction and deduction) and special historical methods (historical genetic method, historical comparative method and method of historical reconstruction).

**Scientific novelty and significance of the results**. For the first time the phenomena of the emigration of the nobility from the Russian duchies to the GDL in the century was studied. The social differentiation of the mass of emigrants was made, the specification of quantity of the phenomena was given, the changes in the GDL's policy towards emigrants occurred during the period under discussion was traced, the reasons of those changes were specified, position of the emigrants in the GDL including minor nobility was analyzed. Some written sources were put into use.

The conclusions can be used in preparation of scientific papers on Belarusian history, in the teaching $XV^{th}$ –$XVI^{th}$ century social and political history of Russia and Belarus as well as by scientific, archive and museum workers in their professional activity.

